# СУЧАСНЫЯ МАДЭЛІ І МЕТАДЫ ВЫКЛАДАННЯ МОЎ І ЛІТАРАТУР

## КУЛЬТУРА ЧЫТАННЯ ВУЧНЯЎ ЯК ПРЫЯРЫТЭТНЫ НАКІРУНАК СУЧАСНАЙ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Л.С. Васюковіч**
дацэнт кафедры правазнаўства і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Віцебскага філіяла Міжнароднага ўніверсітэта "МІТСО", доктар педагагічных навук
(г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь)

Праблема чытання і разумення тэксту застаецца адной з самых актуальных у школьным навучанні, што пацвярджаецца шматлікімі навукова-метадычнымі напрацоўкамі вучоных і педагогаў-практыкаў. Вывады адносна маніторынгу чытацкай пісьменнасці беларускіх навучэнцаў у міжнародных даследаваннях PISA характарызуюць узровень культуры чытання як прымальны: "Большасць вучняў (76,6 %) паказалі вынік чытацкай пісьменнасці, які перавышае парогавы ўзровень. Пры гэтым найбольш шматлікая група ўдзельнікаў тэсціравання (56,6 %) прадэманстравала навыкі, адпаведныя другому і трэцяму ўзроўням чытацкай пісьменнасці. Гэта даказвае, што больш за палову вучняў здольны выявіць і абагульніць інфармацыю ў адпаведнасціі з шэрагам крытэрыяў, вызначыць асноўную ідэю тэксту, параўнаць інфармацыю з улікам аднаго або некалькіх паказчыкаў (у тым ліку і супярэчлівую інфармацыю), устанавіць сувязі ўнутры тэксту і з жыццёвымі ведамі"[1, с. 59]. Нягледзячы на суцяшальныя меркаванні, культура чытання вучняў – аб'ект клопатаў метадыстаў, занепакоеных невысокім узроўнем чытання і разумення тэкстаў школьнікамі па розных вучэбных прадметах. *Мэта артыкула*: асэнсаваць культуру чытання вучняў як умову дасягнення стратэгічных вынікаў сучаснай адукацыі.

Развіццё культуры чытання знаходзіцца ў крузе прыярытэтных накірункаў, замацаваных у зацверджаных стандартах агульнай сярэдняй адукацыі. У дакуменце выразна прапісана, што пры вывучэнні ўсіх прадметаў школьнай праграмы арганізуецца праца па фарміраванні і развіцці чытацкай пісьменнасці. Агульная місія чытання акрэсліваецца як сродак дасягнення прадметных і метапрадметных кампетэнцый вучняў [2]. З улікам запатрабаванасці праблема чытання навучэнцаў знаходзіцца ў зоне павышанай увагі настаўнікаў, бібліятэкараў, грамадскасці. Дыяпазон пазіцый, ацэнак вар'іруецца ад дэпрэсіўнай канстатацыі глыбокага крызісу чытацкай культуры да неабходнасці сцвярджэння новай мадэлі чытання ва ўмовах інфармацыйнага грамадства.

Любы вопыт, у рэчышчы якога чытанне становіцца сродкам уваходжання чалавека ў культуру, важкім фактарам яго асабістых поспехаў у разнастайных сферах жыццядзейнасці, варты пераймання. Трэба зазначыць, што праблема фарміравання свядомага чытача набыла міжнародны рэзананс. Падзенне прэстыжу чытання разглядаецца як глабальная тэндэнцыя, не абумоўленая этнічнымі асаблівасцямі развіцця. Як правіла, міжнародная супольнасць аднолькава зацікаўлена рэагуе на праблему, прымаючы нацыянальныя праграмы, скіраваныя на падтрымку і развіццё практык дзіцячага/маладзевага чытання, на пошукі рацыянальных падыходаў, метадаў і методык па выхаванні чытачоў "лічбавага пакалення", іх камфортнага існавання ў кніжным свеце. Выхаванне свядомага чытача мае глабальны, цывілізацыйны характар, культура чытання не залежная ад расавых, нацыянальных, эканамічных, палітычных і іншых асаблівасцей развіцця краіны.

Вопыт далучэння да чытання мае багатыя традыцыі і рэалізуецца ў разнастайных формах, якія ўключаюць ініцыятывы дзяржаўнага, прафесійнага і грамадскага ўзроўню. Пры ўсёй розніцы фармулёвак, канцэптуальных падыходаў да чытання

інтэграваным момантам з'яўляецца новае бачанне шляхоў выхавання сучаснага чытача. Гэта выяўляецца ў агульных пазітыўных тэндэнцыях: арыентацыя на актыўныя формы навучання, увага да матывацыйна-каштоўнасных установак, змяненне стылю зваротаў складальнікаў падручнікаў да чытачоў – з аўтарытарна-павучальнага на сяброўска-добразычлівы, апора на калектыўнае абмеркаванне ідэй, думак, меркаванняў, абнаўленне круга чытання і інш.

Ідэя далучэння школьнікаў да чытання знаходзіць увасабленне ў дзейнасці бібліятэк, музеяў, СМІ, у пошуках арыгінальных шляхоў прапаганды чытацкай цікавасці ў рэгіёнах. Новым крокам у гэтым напрамку з'яўляюцца бібліяграфічныя электронныя фарматы інфармацыі пра літаратурныя выданні з паралельным відэа-радам, рэкамендацыйныя спісы (і доступ да кніг).

У рэчышчы сучасных падыходаў фарміруюцца класічна-традыцыйныя адносіны да чытання як спосабу духоўна-маральнага развіцця асобы, асэнсаванне культуры чытання як неабходнай умовы дасягнення адукацыйных і сацыяльных мэт. У агульным кантэксце вырашэння праблемы актуалізуецца ідэя кансалідацыі намаганняў настаўнікаў, бібліятэчных супрацоўнікаў, выкладчыкаў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, дзяржаўных органаў. Мажліва, на сённяшні дзень недаацэньваецца патэнцыял міжпрадметнай інтэграцыі, аб'яднання магчымасцей вучэбна-выхаваўчай дзейнасці школьных устаноў, дадатковай адукацыі. Надзвычай важна, каб арыгінальныя, нестандартныя формы працы ў гэтым накірунку пазбаўляліся лакальнасці, эпізадычнасці і набывалі маштабны характар, аўтарытэт і прызнанне не толькі саміх устаноў адукацыі, культуры, але і валанцёраў чытання, дзіцячых і моладзевых ініцыятыў. Трэба, каб кожны свядомы грамадзянін пранікся пачуццём адказнасці перад сабой, уласнымі і чужымі дзецьмі за ўзровень чытання і развіццё кніжнай культуры сваёй краіны.

Запатрабаванае выкарыстанне сучасных інфармацыйных рэсурсаў для фарміравання новага, прываблівага іміджу Homo legens – чалавека, які чытае. Неабходна “галасаваць сэрцам” за чытанне кніг не толькі праз ўступныя артыкулы да падручнікаў на тэму “Любіце чытаць”, не толькі праз выказванні класікаў літаратуры, але і на прыкладзе сучаснікаў – маладых і паспяховых людзей, якія самі шукалі і знайшлі спосабы любові і пакланення Слову. Ствараючы ўласныя тэксты пра чытанне і чытачоў, яны бачаць у кнізе галоўнага героя, сябра, мудрага і аўтарытэтнага суразмоўцу:

*Маё дзяцінства прайшло на народных казках – беларускіх і замежных, творах Купалы, Коласа, Пушкіна і Лермантава. Казкі з прыгожых зборнікаў чытала мама, а паэзію – рускую і беларускую XIX–XX стагоддзяў дэкламаваў на памяць бацька. Старэйшыя класы і каледж прайшлі ў паэзіі Янкі Купалы* (*са мной у Мінск паехаў зборнік вершаў, напэўна, 1988 года, з залацістай аздобай на вокладцы, – там мой улюбёны верш ever – “І прыйдзе”*) *Максіма Багдановіча (“Вянок”) і паэтаў рускага Сярэбранага веку, проза Змітрака Бядулі* (*апавяданні і абразкі*)*, Васіля Быкава* (*асабліва ўразіла “Ваўчыная яма”*)*... Філфак адкрыў для мяне дзівосны новы свет беларускай і замежнай літаратуры* (Марына Верабей, літаратуразнаўца, паэтка).

У аснове падобных выказванняў – асабістыя эмацыйныя адносіны да твораў, пра якія расказваюць маладыя кніжнікі, бо менавіта ў гэтых кнігах яны знайшлі адказы на пытанні, што задае кожны свядомы чалавек на пачатку свайго станаўлення. У эсэістычных разважаннях – зварот да самакаштоўнага, уласнага чытацкага вопыту. Гэтыя апавяданні-адкрыцці матывуюць на своечасовае прачытанне кніг з “залатой паліцы”, паколькі “ёсць кнігі, якія абавязкова трэба прачытаць своечасова… Потым іх можна перачытваць, але прачытаць трэба ў час, інакш штосьці незаменнае будзе страчана назаўсёды” [3, с. 88]. Што да “залатой паліцы”, то на ёй павінны “жыць” кнігі, якія “з'яўляюцца для чалавека базавымі і вызначаюць яго адносіны да іншых тэкстаў”

[4, с. 81]. Сучасная школа заклікана фарміраваць устойлівы інтарэс да чытання, рыхтаваць кампетэнтнаснага чытача, які валодае наборам кагнітыўных, творчых, рэфлексійных, метадалагічных навыкаў. Гэтыя “метакагнітыўныя якасці вызначаюць узровень сфарміраванасці чытацкай дзейнасці, закліканай забяспечыць пазнанне і творчасць” [5, с. 12].

Чытанне як праца з інфармацыяй – прынцыпова новая місія школы. Ажыццяўленне гэтай місіі можа адбывацца ў кантэксце фарміравання навыкаў і кампетэнцый XXI стагоддзя, да якіх, апроч чытання, аднесены камунікацыя, супрацоўніцтва, крытычнае мысленне. Гэтая звышзадача можа быць выканана праз выпрацоўку комплексу ўменняў:

– вылучэнне неабходнай інфармацыі, засваенне метадаў інфармацыйнага пошуку;

– адэкватнае ўспрыманне і разуменне спецыфікі інфармацыі з тэкстаў навуковага, мастацкага, публіцыстычнага, афіцыйна-дзелавога стыляў;

– выбар неабходнай інфармацыі з рознафарматных, разнажанравых тэкстаў;

– адэкватная пабудова выказванняў у вуснай і пісьмовай формах на аснове прачытанага ў адпаведнасці з мэтай (падрабязна, сцісла, выбарачна, разгорнута) і нормамі пабудовы тэксту (захаванне тэмы, жанру, стылю, запланаванага фармату і інш.);

– фарміраванне і развіццё ўменняў інтэграваць, ацэньваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц;

– выпрацоўка ўменняў працаваць з тэкстам у камандзе і індывідуальна.

Сучасная рэальнасць спараджае новую тэндэнцыю: для часткі вучняў ужо ў школе чытанне перастае быць культурнай патрэбнасцю, неабходнасцю і не ўспрымаецца як крыніца асобаснага росту, эстэтычнага і духоўнага развіцця. Чытанне выступае ў якасці дадатку да вучобы. Да ўспрымання сур’ёзнай (у тым ліку і вучэбнай) літаратуры, якая патрабуе інтэлектуальных і эмацыянальных намаганняў, падлеткі часта не падрыхтаваны. Як сцвярджаюць сацыёлагі, найбольш запатрабаванымі аказваюцца жанры фантастыкі і вострасюжэтнай літаратуры (фэнтэзі, трылеры, дэтэктывы, коміксы і інш.). Чытанне сённяшніх маладых людзей часта мае выпадковы характар і нярэдка вызначаецца “модай” на тую або іншую кнігу сярод аднакласнікаў, бліжняга круга. Гэтыя факты варта ўспрымаць як сур’ёзную праблему страты ў традыцыях чытання ўзораў кніжнай культуры, літаратурнай класікі, што складала прадмет увагі некалькіх пакаленняў. Нівеліруецца само паняцце *якасць чытання* – такія яго характарыстыкі, як наяўнасць сфарміраванага інтарэсу да чытання як унутранай патрэбнасці, пашырэнне кругу чытання за кошт літаратуры розных відаў і жанраў, здольнасць да ўспрымання аб’ёмных тэкстаў і інш.

Што да методыкі, то варта сцвердзіцца ў немагчымасці зводзіць мнагастайнасць спосабаў спасціжэння тэксту (асабліва мастацкага) праз адназначныя, жорсткія алгарытмы чытання. Ёсць сэнс прыслухацца да прызнаных аўтарытэтаў: “Розныя кнігі трэба ўмець чытаць па-рознаму. З гэтай прычыны ўрокі чытання павінны адказваць на мноства неабходных жыццёвых пытанняў… Мастацкі твор – не задача па фізіцы або матэматыцы: у ім мноства “ўваходаў” і “выхадаў” для яго асэнсавання” [6, с. 14]. Праблеме фарміравання навыкаў культуры чытання прысвечана немалая колькасць метадычных і псіхалагічных прац, якія рознааспектна прадстаўляюць складаны прадмет даследавання. Нягледзячы на мноства распрацаваных канцэпцый, праграм, падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, дадатковых матэрыялаў, на сённяшні дзень школьная практыка дэманструе дастаткова сціплыя поспехі. Прычыны гэтага бачацца наступныя:

– фарміраванне навыку асэнсаванага чытання – працэс неаднародны, нелінейны, ён не павінен згортвацца, мінімізавацца;

– сучасныя падручнікі, утрымліваючы вялікую колькасць заданняў *прачытайце тэкст,* не вучаць чытанню як навыку здабываць і асэнсоўваць інфармацыю;

– механізм чытання не раскрываецца перад вучнямі, умовы заданняў не суправаджаюцца інструкцыямі, зводзяцца да шматпаўтаральных патрабаванняў: *прачытайце тэкст выразна, растлумачце назву тэксту, выпішыце ключавыя словы* і інш. Такія заданні разлічаны або на вусныя каментарыі настаўніка, або на моўную інтуіцыю навучэнца. Гэта азначае, што чытацкія ўменні з улікам вопыту складальнікаў падручнікаў згортваюцца, арыенціровачная аснова чытання як сістэма дзеянняў пераводзіцца ў аўтаматызаваны аспект;

– перабольшванне магчымасцей Інтэрнэту, адназначнай перакананасці вучняў у тым, што інфармацыя, змешчаная ў традыцыйных кніжных крыніцах, з'яўляецца незапатрабаванай;

– скарачэнне часу на чытанне, яго падмена спажываннем аблегчанай інфармацыі з сацыяльных сетак. Пры гэтым чытанне набывае прагматычны характар, не ўспрымаецца як духоўна-інтэлектуальная практыка;

– дастаткова фармалізаваная падача навуковых тэкстаў, якія не суправаджаюцца каментарыямі пра значэнне працы з імі: выкарыстанне тэрмінаў, азначэнняў, спецыяльнай лексікі робіць чытанне складаным працэсам, аднак вучыць паглыбленаму разуменню, запамінанню і засваенню прачытанага, рыхтуе да працы з прафесійнай інфармацыяй;

– навучэнцы павінны зразумець: вучэбная, спецыяльная літаратура – істотны кампанент пазнавальнай дзейнасці. Адпаведна навуковыя тэксты павінны чытацца асэнсавана, няспешліва, паколькі тэарэтычныя веды як набытак навуковага стылю немагчыма перадаць мовай паўсядзённых зносін. З гэтай прычыны прысутнасць тэрмінаў у навуковых тэкстах не выпадковая: яны фіксуюць вынікі даследчых пошукаў, працы многіх пакаленняў вучоных.

Адной з форм далучэння да чытання з улікам сённяшніх магчымасцей можна лічыць медыятэкі, што сістэматызуюць медыярэсурсы на лічбавых носьбітах. Першыя вопыты даказваюць: часта інфармацыя, атрыманая з Інтэрнэту, становіцца падставай для звароту да беларускамоўнай кнігі або да творчасці пісьменніка. Інтэрнэт-рэсурсы варта выкарыстоўваць у якасці ўнікальнай магчымасці для станаўлення і выхавання чытача: сетка інтэрнэт-магазінаў, чаты для абмеркавання класікі і кніжных навінак, бясплатныя электронныя бібліятэкі, інтэрнэт-апытванні – сучасны рэсурс у праектаванні беларускамоўнага адукацыйнага асяроддзя, матываваных патрэбнасцей у чытанні (праекты, дыскусіі, выставы, віртуальныя экскурсіі і г. д.). Так, цікавы вопыт працы з рознымі відамі і жанрамі медыятэкстаў прапанаваны пры вывучэнні гісторыі і граматазнаўства [7].

Немалаважную ролю, на нашу думку, адыгрываюць дэманстраванне педагогамі любімых кніг, асабістых густаў у чытанні, захопленасць словам, культурай. Чытанне павінна пазіцыянавацца як норма жыцця не толькі класікамі (гэтага ніхто не адмаўляе), але і паспяховымі маладымі людзьмі. Падобныя прызнанні, разважанні не з'яўляюцца прывілеяй выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін. Наадварот, тэксты-прысвячэнні кніжнай культуры з вуснаў прадстаўнікоў матэматычных, прыродазнаўчых дысцыплін дапамагаюць пашырыць чытацкае поле культуры, пабачыць праз слова розныя грані дзейнасці творчага чалавека. Камунікаванне, узаемаабмен інфармацыяй, каштоўнасцямі, эмоцыямі, грамадзянскімі пазіцыямі стварае жыццёвы дыялог у кантэксце павагі да слова, кнігі, культуры. Ганаровую місію свядомых чытачоў маглі б выконваць не толькі прадстаўнікі адукацыі, бібліятэчныя рупліўцы, але і прадстаўнікі выдавецкага, кніжнагандлёвага бізнесу.

Стратэгіяй сучаснага навучання становіцца чытанне – вучэбнае, навуковае, агульна-культурнае, – што развівае навыкі самастойнай працы, выступае асновай пісьма, гаварэння, слухання, фарміруе светапоглядныя ўстаноўкі, устойлівую цікавасць да кнігі. Чытанне павінна праецыравацца як рэальны камунікатыўны працэс, апасродкаваны тэкстам. Атрыманая інфармацыя пры чытанні служыць камунікатыўным задачам – зразумець, прааналізаваць, абмеркаваць змест, аформіць уласнае меркаванне, выкарыстаць тэкст як аснову для пісьмовай камунікацыі – праз складанне анатацый, канспектаў, тэзісаў. Чытанне набудзе сваю духоўную сутнасць, калі ў ім будуць бачыць не толькі сродак інфармацыі, папаўнення ведаў, але і ўсведамляць яго як працэс выхавання і развіцця асобы, што фарміруе жыццёвыя каштоўнасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Позняк, А.В. PISA – 2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А.В. Позняк; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск : Медиасонт, 2021. – 65 с.

2. Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.03.2024.

3. Чудакова, М.О. Литература в школе: читаем или проходим: кн. для учителя / М.О. Чудакова. – М. : Время, 2013. – 148 с.

4. Байяр, П. Искусство рассуждать о книгах, которых вы не читали / П. Байяр; перевод с франц. А. Поповой. – М. : Текст, 2012. – 185 с.

5. Сметанникова, Н.Н. Чтение и грамотность в современном мире /Н.Н. Сметанникова // Вестник Челябинской академии культуры и искусств. – 2019. – № 4. – С. 10 – 18.

6. Генис, А.А. Уроки чтения: камасутра книжника / А.А. Генис. – М. : АСТ, 2013. – 347 с.

7. Палейка, А.А. Медыятэксты ў навучанні гісторыі і грамадазнаўству: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / А.А. Палейка. – Мінск : Выдавецкі цэнтр БДУ, 2018. – 96 с.

## НОВЫЕ ФОРМЫ СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ АДАПТАЦИИ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ

**Э.О. Гаврикова**
доцент кафедры языкознания и литературоведения
ФГАОУ ВО «Тюменский государственный университет»
(г. Тюмень, Россия)

Современная высшая школа переживает трансформацию, которая сопровождается увеличением роли международного сотрудничества и интернационализацией – объективным процессом устойчивого взаимодействия и взаимовлияния национальных систем высшего образования на основе общих целей и принципов, отвечающих потребностям морового сообщества и отражающих прогрессивные тенденции нового столетия [1, с. 50]. Каждый год увеличивается количество студентов, желающих получить профессию и качественное высшее образование в России. Сегодня РФ занимает 4 место в списке стран, популярных для въезда мигрантов. Количество иностранных студентов в российских вузах за последние 20 лет возросло в пять раз [2, с. 147]. Россия занимает 6 место по количеству академических мигрантов. Сейчас в стране обучается более 355 тысяч иностранных студентов, что составляет 7,6 %